# АДЛЮСТРАВАННЕ ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАЦЫ З'ЕЗДАЎ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ "ЗВЯЗДА"

К.С. Разуванава (Мінск)

Аб'ектыўнае і ўсебаковае інфармаванне насельніцтва краіны пра найбольш значныя падзеі ва ўсе часы было асноўнай грамадскай задачай друкаваных СМІ. Нягледзячы на імклівае развіццё тэхнічных сродкаў перадачы дадзеных, з'яўленне новых формаў іх прадстаўлення (у тым ліку, паралельнае размяшчэнне інфармацыі на афіцыйных сайтах традыцыйных выданняў), сучасныя творчыя аўтарскія калектывы працягваюць даводзіць да сваіх чытачоў розныя аспекты грамадска-палітычных і культурных з'яў у жыцці Рэспублікі Беларусь і замежжа.

Пачынаючы са жніўня 1917 г. газета "Звязда" з'яўляецца адным з найбольш значных выданняў нашай Бацькаўшчыны, ролю якога ў адлюстраванні падзей беларускай рэчаіснасці цяжка перабольшыць. Яркім доказам такога сцвярджэння з'яўляюцца размешчаныя на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў на яе старонках артыкулы, прысвечаныя правядзенню з'ездаў беларусаў свету.

Вартасць асвятлення дадзенай праблемы абумоўлена, па-першае, значнасцю падзеі ў жыцці беларускай нацыі: некалькі ліпеньскіх дзён, калі грамадзяне Беларусі прымаюць на гістарычнай радзіме асоб, якія нават за яе межамі не страцілі ўсведамлення сваёй еднасці з "блакітнавокай". Для часткі з іх гэта шанц наведаць сваю старую вёску або пакланіцца магілкам родных, для іншых – магчымасць адчуць сябе дома, адкінуць на час статус "нацыянальнай меншасці". Па-другое, нягледзячы на рэгулярнасць правядзення дадзенага мерапрыемства (з 1993 г. з перыядычнасцю адзін раз у чатыры гады ў г. Мінску праведзена пяць такіх з'ездаў), асобныя з іх былі прадстаўлены грамадскасці на старонках газеты "Звязда" не ў роўнай ступені. Так, Першы з'езд беларусаў свету стаў сапраўдным святам у жыцці краіны: мерапрыемства праводзілася на працягу васьмі дзён, уключала ў сябе не толькі пленарныя паседжанні запрошаных і гасцей, але і шэраг культурных мерапрыемстваў як у сталіцы, так і на тэрыторыі значных гісторыка-культурных помнікаў і мясцін. Адпаведна, менавіта ён апынуўся пад пільнай увагай супрацоўнікаў выдання. Больш за гэта, наўмысна для ўдзельнікаў з'езда і ўсіх зацікаўленых асоб рэдкалегіяй "Звязды" быў падрыхтаваны спецыяльны выпуск "Маці Краіна" [15], які можна лічыць сапраўднай візітнай карткай беларусаў (як грамадзян, так і замежных жыхароў). Адначасова мерапрыемства атрымала шырокую абвестку: карэспандэнтамі газеты загадзя былі прадстаўлены праграма з'езда, яго эмблема (стылізаваная выява князёўны Прадславы – беларускай асветніцы Ефрасінні Полацкай) з абгрунтаваннем такога выбару, дадзеным яе аўтарам – мастаком Эдуардам Агуновічам ("Прадслава – аб'яднальны пачатак ... Яна патронка ўсіх сваіх дзяцей, што разляцеліся па свеце") [22].

Другі, трэці і пяты з'езды, якія адбыліся адпаведна ў ліпені 1997, 2001 і 2009 гг., хоць і атрымалі пэўнае асвятленне на старонках газеты "Звязда", аднак гэта былі ўжо больш сціплыя артыкулы (не менш за тры на кожны год: першы – напярэдадні з'езда, паведамляў аб ім, вызначаў запланаваную праграму і памяшканне правядзення пленарнага паседжання; другі прадстаўляў прывітанне Главы дзяржавы да замежных суайчыннікаў; трэці з'яўляўся своеасаблівым падвядзеннем вынікаў і пералічваў асноўныя рашэнні з'езда). Тым не менш, даволі часта адзначаныя артыкулы распачыналі серыю нарысаў з гісторыі жыцця і творчасці асобных беларусаў замежжа або нават цэлых суполак [2; 3; 12].

Рэпазіторый ВДУ

Пры гэтым зварочвае на сябе ўвагу той факт, што падзеі Чацвёртага з’езда беларусаў свету (ліпень 2005 г.) увогуле не знайшлі адлюстравання ні на старонках газеты “Звязда”, ні ў выглядзе асобнага зборніка дакументаў і матэрыялаў (гэта характэрна для першых трох з’ездаў), ні нават у форме асобнага кароткага агляда (тычыцца Пятага з’езда беларусаў свету) [8; 11; 17]. Пры гэтым у паведамленні Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына” адзначаецца, што на мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі шэрага сродкаў масавай інфармацыі (у тым ліку дзяржаўных) [26].

Нарэшце, своечасовае з’яўленне інфармацыйных паведамленняў аб ходзе з’ездаў і іх наступствах было асабліва актуальным яшчэ і з той кропкі гледжання, што вышэй адзначаныя зборнікі дакументаў з’явіліся значна пазней за час правядзення мерапрыемстваў. Такім чынам, матэрыялы, прадстаўленыя на старонках газеты “Звязда”, дазволілі насельніцтву края пазнаёміцца і пры жаданні прыняць удзел у паседжаннях з’езда і запланаваных святочных мерапрыемствах.

Як ужо было адзначана, найбольш поўна і паслядоўна на старонках газеты “Звязда” былі адлюстраваны падзеі Першага з’езда беларусаў свету. Яшчэ ў чэрвені 1993 г. з’явіліся артыкулы, прысвечаныя абгрунтаванню створанай эмблемы з’езда, а таксама асвятленню гістарычнай ролі дадзенай падзеі [10]. Адначасова быў прадстаўлены падрабязны план правядзення святочнай (3 – 7 ліпеня) і практычнай частак мерапрыемства (8 – 10 ліпеня) [18]. У наступных нумарах (на працягу 3 – 13 ліпеня) карэспандэнтамі выдання паслядоўна асвятляліся фактычна ўсе падзеі з’езда: удзел дэлегатаў і гасцей з’езда ва ўрачыстасцях з нагоды 770-годдзя з заснавання Нясвіжа, 740-годдзя з дня каранацыі літоўскага князя Міндоўга ў Навагрудку, святкаванне “Купалля” на радзіме Я. Коласа, наведванне экспазіцыі Мірскага замка, правядзенне сумеснай мастацкай выставы “Жыве Беларусь!” у Палацы мастацтваў у г. Мінску.

Неабходна адзначыць, што карэспандэнтам газеты ўдалося перадаць думкі і ўражанні вялікай колькасці ўдзельнікаў і гасцей з’езда, якія не выступалі на пленарных паседжаннях і не прымалі ўдзел у працы “круглых сталоў” і Трэцяй Усебеларускай палітычнай канферэнцыі, што адбылася ў канферэнцзале Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы [6; 7]. У той жа час, матэрыялы выдання самі па сабе з’яўляюцца сапраўднай крыніцай па адлюстраванні асобных момантаў у ходзе афіцыйнай часткі сустрэчы. Так, у склад зборніка матэрыялаў і дакументаў не ўвайшлі тэксты выступленняў асобных прамоўцаў (напрыклад, Г. Бураўкіна), паколькі не былі перададзены арганізатарам з’езда [5].

Побач з гэтым, значная колькасць фотаздымкаў з месца падзей і невялікіх нарысаў з жыцця і творчасці асобных удзельнікаў (амерыканскага беларуса – мастака М. Пашкевіча, пецярбургскага беларуса – супрацоўніка Расійскай нацыянальнай бібліятэка бібліёграфа А. Разумава і інш.) [2; 9], перадача тых гарачых дыскусій, якія мелі месца у час паседжанняў, дазваляюць уявіць сабе Першы з’езд беларусаў свету як неардынарную з’яву ў жыцці беларусаў, сапраўдную спробу прымірыць розныя погляды і перакананні, “практычна ўцягнуць дыяспару ў жыццё Беларушчыны” [20].

Дарэчы, да гонару супрацоўнікаў газеты, ім удалося максімальна аб’ектыўна перадаць усю напружанасць з’езда, нават суб’ектыўныя і эмацыянальныя выказванні асобных ўдзельнікаў. Доказам такой пазіцыі рэдакцыі і праявам павагі да падобнага прафесійнага падыходу з’яўляецца той факт, што менавіта на старонках газеты “Звязда” быў надрукаваны зварот прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі (членаў арганізацыйнага камітэта і будучых ўдзельнікаў



Репозиторий ВГУ

з’езда) супраць спробаў журналістаў асобных дзяржаўных выданняў даць негатыўную характарыстыку тых суайчыннікаў, якія аказаліся па-за межамі Беларусі пасля Другой Айчыннай вайны [1].

Асобную старонку ў асвятленні Першага з’езда беларусаў свету, як ужо было адзначана, склала асобнае выданне газеты – спецвыпуск “Маці Краіна”. Гэта ілюстраванае выданне моджна назваць кароткай нарыс жыцця беларусаў свету: на старонках прадстаўлены дадзеныя па гісторыі, культуры і дэмаграфічным стане Рэспублікі Беларусь, шляхах фарміравання і цэнтрах беларускай дыяпары за мяжой, навукова-даследчых і культурых цэнтрах, стане нацыянальных суполак дыяспары і беларускай царквы, адрасы і кантактныя тэлефоны дзяржаўных арганізацый і ўстаноў краіны, у якія можна звярнуцца па самых розных пытаннях. Значнае месца ў выданні займаюць рэкламных нататкі пра найбольш вядомыя беларускія прадпремствы, прыродных багаццях краіны з экспартным патэнцыялам. У дадатак на многіх старонках “Маці Краіны” прыводзяцца беларускія вершы і выказванні суайчыннікаў – удзельнікаў з’езда, каляндар з рэлігійнымі і традыцыйнымі святамі на другую палову 1993 г., апісанне найбольш вядомых помнікаў беларускага дойлідства, а таксама прэзентацыя беларускіх вытворцаў адзення і рэцэнты старадаўніх страў. Як справядліва сцвярджаюць самі аўтары выдання, галоўнай яго мэтай было “паказаць адзінства духу беларускай нацыі”, а таксама размясціць матэрыялы, якія “могуць быць цікавымі для бізнэсмэнаў усяго свету” [1].

Звяртаючыся да матэрыялаў газеты “Звязда”, прысвечаных правядзенню наступных з’ездаў беларусаў свету, можна зноў падкрэсліць, што яны былі нешматлікімі і больш сціслымі па сваім памеры (каля 3-4 артыкулаў па кожным з асветленых мерапрыемстваў). Разам з тым, у іх таксама прысутнічае імкненне аўтараў да больш-менш аб’ектыўнай перадачы падзей (у тым ліку, асобных адыёзных выказванняў удзельнікаў Другога з’езда ў дачыненні да вырашэння праблемы месца правядзення пленарных паседжанняў, развіцця нацыянальнай культуры, Трэцяга з’езда – да збліжэння з Расійскай Федэрацыяй і г.д.) [4; 13; 21; 25]. Адначасова, па-ранейшаму на старонках газеты можна ўбачыць матэрыялы выступленняў асобных прысутных і афіцыйных прадстаўнікаў урада Рэспублікі Беларусь [14; 16; 19], якія не ўвайшлі ў зборнік па выніках Другога і Трэцяга з’ездаў, а таксама не былі змешчаны ў выглядзе асобнага выдання па выніках Пятага з’езда. Тут жа прадстаўлены інтэрв’ю з асобнымі ўдзельнікамі з ліку прадстаўнікоў беларускай дыяспары [23; 24].

Такім чынам, падводзячы вынікі сказанаму, можна адзначыць, што супрацоўнікі газеты “Звязда” правялі плённую працу, якая дазволіла памагчымасці аб’ектыўна адлюстраваць і захаваць для наступных пакаленняў апісанне працэса падрыхтоўкі і правядзення такой значнай для адчування адзінства беларусаў свету падзеі, як з’езды беларусаў свету, выклікаць цікаўнасць да іх з боку сучаснікаў і даследчыкаў гісторыі Беларусі.


1. Аднабаковы погляд на гісторыю непрымальны // Звязда. – 1993. – 6 ліпеня. – С. 3.
2. Беларускі мартыролаг у замежжы // Звязда. – 1993. – 8 ліпеня. – С. 2.
3. Беларусы Аргенціны // Звязда. – 2001. – 8 ліпеня. – С. 2.
4. Беларусь у пошуках паразумення? // Звязда. – 1997. – 29 ліпеня. – С. 2.
5. Бураўкін, Г. Прыйшоў час разам паклапаціцца пра сённяшні і заўтрашні дзень Бацькаўшчыны… / Г. Бураўкін // Звязда. – 1993. – 8 ліпеня. – С. 1, 3.
6. Гавораць удзельнікі з’езда // Звязда. – 1993. – 7 ліпеня. – С. 3.
7. Гавораць удзельнікі з’езда // Звязда. – 1993. – 9 ліпеня. – С. 1.

8. Другі і Трэці з'езды беларусаў свету: Матэрыялы і дакументы / МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"; уклад. А. Макоўская; рэд. рада: Вінярскі Г. [і інш.] – Мінск, 2004. – 371 с.
9. Карціны з-за акіяна // Звязда. – 1993. – 7 ліпеня. – С. 1, 3.
10. Крукоўскі, М. Нацыянальна свядомыя беларусы павінны быць апосталамі сваёй справы / М. Крукоўскі // Звязда. – 1993. – 22 чэрвеня. – С. 2.
11. Кушнер, В.Ф. Пяты з'езд беларусаў свету / В.Ф. Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 11. – С. 50 – 51.
12. Латвія: шляхамі беларушчыны // Звязда. – 2001. – 11 ліпеня. – С. 7.
13. Малафееў, П. У Літве, як мне здаецца, беларусы маюць лепшыя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры, чым у сябе на Бацькаўшчыне / П. Малафееў // Звязда. – 1997. –30 ліпеня. – С. 3.
14. Масты з цэлым светам // Звязда. – 1997. –21 ліпеня. – С. 2.
15. Маці Краіна (Звязда. Спецыяльны выпуск да Першага з'езда беларусаў свету). – Мінск, 1993. – 24 с.
16. Перад сваёй дыяспарай мы ў даўгу // Звязда. – 1997. –30 ліпеня. – С. 3.
17. Першы з'езд Беларусаў свету (8-10 ліпеня 1993 г., г. Мінск): Матэрыялы і дакументы / Уклад. Г. Сурмач. – Мінск, 1997. – 334 с.
18. Рэгулямін Першага з'езда беларусаў свету // Звязда. – 1993. – 30 чэрвеня. – С. 2.
19. Сёння ў Беларусі распачынае работу Другі з'езд беларусаў свету // Звязда. – 1997. – 26 ліпеня. – С. 2.
20. Тры дні ў ліпені, якія абнадзеілі Беларусь // Звязда. – 1993. – 13 ліпеня. – С. 3.
21. Тут бушавалі страсці і эмоцыі // Звязда. – 1997. – 29 ліпеня. – С. 2.
22. Усіхняя матка, Прадслава, заступніца Беларусі… // Звязда. – 1993. – 22 чэрвеня. – С. 1 – 2.
23. Харытонава, Я. Пра што я хацела б гаварыць на з'ездзе беларусаў свету… / Я. Харытонава // Звязда. – 1997. – 25 ліпеня. – С. 4.; Хачу пабачыць, што робіцца на Радзіме // Звязда. – 1997. –30 ліпеня. – С. 3.
24. Хачу пабачыць, што робіцца на Радзіме // Звязда. – 1997. –30 ліпеня. – С. 3.
25. Ці збяруцца беларусы свету зноў? // Звязда. – 2001. – 10 ліпеня. – С. 3.
26. Чацвёрты з'езд беларусаў свету // Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" [Электронный ресурс]. – 2002. – Рэжым доступа: http://zbsb.org/index.php?option=com_content&view=article&id=69&Itemid=103. – Дата доступа: 16.04.2012.

Репозиторий ВГУ